# КАСТУСЁЎ Рыгор Андрэевіч



Нарадзіўся 17 красавіка 1957 г. у вёсцы Цяхцін Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці. Працоўную дзейнасць пачаў у 1974 г. у якасці рабочага саўгаса «Друць» Бялыніцкага раёна.

Пасля службы ў войску вучыўся ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, дзе атрымаў спецыяльнасць інжынера-механіка. Працаваць вярнуўся на малую радзіму, дзе неўзабаве стаў галоўным інжынерам.

У 1988 г. калектывам быў абраны дырэктарам гаспадаркі «Іскра» Бялыніцкага раёна.

З 1991 г. працаваў у МПМК — 283 (г. Шклоў) галоўным механікам. У 1995 г. стаў дырэктарам раённага вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі г. Шклова.

З 2002 па 2004 г. — дырэктар сумеснага беларуска-ўкраінскага прадпрыемства «Гідрасіла — Белая Русь», затым — прыватны прадпрымальнік, камерцыйны дырэктар прыватнага прадпрыемства ў г. Магілёве.

З 2008 г. — намеснік генеральнага дырэктара таварыства з абмежаванай адказнасцю «Асвейская будаўнічая кампанія».

Грамадскую і палітычную дзейнасць Р.А.Кастусёў пачаў у 1989 г. Быў старшынёй Шклоўскай раённай арганізацыі Партыі БНФ, кіраўніком Магілёўскай абласной арганізацыі Партыі БНФ.

З 2009 г. — намеснік старшыні Партыі БНФ.

Жанаты, бацька трох дзяцей (дзвюх дачок і сына).